Viestki544.qxd 6/4/2011 7:44 PM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

**№ 6 (544)**
**Чэрвень 2011 г.**



*Belarusan American Association, Inc.*
*P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572*

Сусьветнае сеціва: *www.baza-belarus.org*


# Кангрэс БАЗА ў Нью-Джэрзі

У Гайлэнд-Парку, штат Нью-Джэрзі, 28 траўня прайшоў Кангрэс БАЗА, скліканы непрызнанай Нью-Ёрскім аддзелам Галоўнай управай БАЗА. На парадак дня не былі пастаўленыя пытаньні, пра якія заяўляў Нью-Ёрскі аддзел. Перад Кангрэсам Нью-Ёрскі аддзел прыняў рэзалюцыю аб няўдзеле ў гэтым Кангрэсе і заявіў аб непрызнаньні ўсіх дзеяньняў і пастановаў, якія зрабіла або зробіць нелегітымная Галоўная управа.

Прадстаўніца аддзелу на Кангрэсе сп-ня Валянціна Якімовіч зачытала дакумэнты аб няўдзеле ў Кангрэсе і адносінах да Галоўнай управы, што былі прынятыя Нью-Ёрскім аддзелам.

Падчас правядзеньня дзеля неканструктыўнай пазыцыі кіраўніцтва Кангрэсу яго вырашыла пакінуць бальшыня прадстаўнікоў аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі. Такім чынам, на Кангрэсе фактычна засталіся толькі прадстаўнікі, штучна створанага ў супрацьвагу Нью-Ёрскаму аддзелу БАЗА так званага “Бруклінскага” аддзелу, і непрызнаныя сябры дзеючай Галоўнай управы, разам зь некалькімі дэлегатамі ад гурткоў БАЗА, падкантрольных ёй. Ад аддзелу ў Кліўлэндзе (Агаё? Стронгсвілі? – дакладная назва дасюль невядомая) асабіста прысутных дэлегатаў не было.

Як стала вядома, тыя, хто застаўся на Кангрэсе абралі старшынёй Галоўнай управы сп-ню Ганну Сурмач.

# КУПАЛЬЛЕ

**Шаноўныя сябры-беларусы!**

*Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі суродзічаў на ўлоньні прыроды. Чароўны купальскі вечар пачнецца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы, далучайцеся да нас. Пачастуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 27 лекавых траваў. Скокніце праз вогнішча з тым, хто вам не абыякавы, не разьняўшы рук. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную купальскую ноч.*

**Калі:** Сьвята пачнецца ў суботу **18 чэрвеня** прыкладна **а 6-й вечара** і працягнецца ўсю самую кароткую ноч году. Дазвол ў парку з 11-й раніцы ў суботу да 11-й раніцы ў панядзелак. Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек.

**Дзе:** Парк **Ward Pound Ridge Reservation** у ***Cross River, NY 10518***. Шукайце хаткі 1, 2, 3 і 4.

**Транспарт:** Цягніком са станцыі **Grand Central** да прыпынку **Katonah**, прыкладна, 1 гадзіна часу ў дарозе.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям.

**Кантакты:** **Пётр і Лена РЫЖЫЯ,** тэлефон: ***(914) 522-0742***, электронная пошта: ***lenabelarus@yahoo.com***
***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Мець з сабою:**
- беларускія строі, вышыванкі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам – доўгія спадніцы, хлопцам – доўгія сьветлыя штаны, ня шторты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу і ваду, спальныя мяшкі, намёты, раскладныя крэслы, ліхтарыкі;
- **$8** з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў за ўезд у парк днём, пасьля 5-й вечара ўезд бясплатны.

Viestki544.qxd 6/4/2011 7:45 PM Page 3 (1,1)



# Травеньскі справаздачна-выбарчы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У Доме Маракоў на Мангэтане 14 траўня адбыўся чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Гэтым разам ён быў справаздачна-выбарчым. Перад пачаткам сходу на яго завіталі прадстаўнікі непрызнаванай аддзелам Галоўнай управы БАЗА, але ім было заяўлена, што, як прадстаўнікі непрызнанай аддзелам структуры, яны ня могуць быць прысутнымі на сходзе.

Напачатку сходу адбылося абраньне выбарчай камісіі ў складзе старшыні, сакратара і двух сябраў для падліку галасоў. Пасьля гэтага прайшла рэгістрацыя сяброў аддзелу для галававаньня. У выніку было зарэгістравана 47 прызнаных дзейнымі галасоў асабіста прысутных на сходзе і тых сяброў, што перадалі ўпаўнаважаньні. Агульная колькасьць сяброў аддзелу, маючых права голасу, склала на дзень сходу 92 чалавекі.

Пасьля гэтага з справаздачамі аб зробленай цягам году працы выступілі старшыня і сакратар аддзелу. Па выніках справаздачаў быў прызнаны абсалюторыюм “з падзякаю”. Дзеля вымушанай адсутнасьці скарбніка аддзелу фінансавая справаздача была перанесеная на пазьнейшы час.

Затым прайшлі выбары новага кіраўніцтва аддзелу. На пасаду старшыні аддзелу сябрамі былі высунутыя дзьве кандыдатуры: сп-ня Валя Якімовіч і сп. Віталь Зайка. Кандыдаты выступілі з прээзентацыяй сваіх праграмаў. Перад галасаваньнем паступіла прапанова правесьці тайнае галасаваньне, але яна не прайшла. Па выніках галасаваньня і падліку галасоў старшынём аддзелу быў абраны сп. Віталь Зайка, за якога былі пададзеныя 25 галасоў. За спню Валю Якімовіч было пададзена 18 галасоў.

Новапераабраны старшыня сфармаваў управу аддзелу, у склад якой увайшлі: Аляксандар Міцкевіч (ганаровы старшыня), Марат Клакоцкі (заступнік старшыні), Валянціна Якімовіч (сакратар), Валянціна Балашчанка (скарбнік), Антон Шукелойць, Віктар Едзіновіч, Уладыка Юры (Эмігідыюш Рыжы), Зьміцер Левіт, Яўген Барысевіч, Віталь Крэмез.

Затым адбылося абмеркаваньне становішча ў аддзеле і БАЗА. Пасьля таго, як выказаліся ўсе жадаючыя, стала зразумела, што пераважная большасьць сяброў аддзелу ня хоча браць удзелу ў надыходзячым Кангрэсе БАЗА. Па выніках абмеркаваньня была прынятая Рэзалюцыя пра няўдзел у Кангрэсе БАЗА дзеля ігнараваньня Галоўнаю управаю патрабаваньняў аддзелу. Рэзалюцыя была прынятая большасьцю галасоў. *(Тэкст яе друкуецца ніжэй.)*

Сябры новастворанай управы засталіся пасьля сходу абмеркаваць бягучыя пытаньні працы аддзелу і пляны на будучыню.

***Віталь ЗАЙКА***

## РЭЗАЛЮЦЫЯ
### аб недаверы дзеючаму старшыні Галоўнай управы БАЗА Вячку Станкевічу і аб няўдзеле ў склікаемым ім Кангрэсе БАЗА

Мы, сябры Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, выказваем недавер дзеючаму Старшыні Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Вячку Станкевічу і ня лічым яго законна абраным на гэтую пасаду. Мы ня лічым законнай сфармаваную ім Галоўную ўправу.

Мы таксама заяўляем аб няўдзеле ў скліканым сп. В. Станкевічам і ягонай незаконнай Галоўнай управай Кангрэсе, які не ўключае ў парадку дня пытаньні, запатрабаваныя Нью-Ёрскім аддзелам БАЗА ў папярэдніх заявах.

*Прынята на агульным сходзе Нью Ёрскага аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку 14 траўня 2011 году.*

## ЗАЯВА
### Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА аб нелегітымнасьці рашэньняў, прынятых складам Галоўнай управы БАЗА начале з В. Станкевічам

Дзеля нявырашанасьці пытаньня аб легітымнасьці цяперашняй Галоўнай управы БАЗА начале з старшынём яе сп. В. Станкевічам і нявырашанага пытаньня легітымнасьці абраньня сп. В. Станкевіча на пасаду старшыні Галоўнай управы БАЗА ў 2007 годзе і пераабраньня на гэтую пасаду ў 2009 годзе, Нью-Ёрскі аддзел БАЗА лічыць усе рашэньні і распараджэньні, прынятыя цяперашнім складам Галоўнай управы і поўнячым функцыі яе старшыні сп. Станкевічам – неправамоцнымі і ня маючымі законнай сілы.

Асабліва гэта тычыцца самавольнага зьмяненьня Статуту БАЗА, а таксама стварэньня на абшары дзеяньня Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА незаконнага “Бруклінскага” аддзелу БАЗА, які быў адвольна складзены з асобаў, што ў бальшыні не жывуць і не працуюць у Брукліне, дзеля таго, каб зрабіць бачнасьць структуры БАЗА, што быццам бы ўхваляе і падтрымлівае незаконную Галоўную ўправу і яе старшыню.

Да вырашэньня пытаньняў, пазначаных напачатку гэтай заявы, усе рашэньні і распараджэньні бягучага складу Галоўнай управы, у тым ліку на Кангрэсах БАЗА, мусяць быць прыпыненыя.

Viestki544.qxd 6/4/2011 7:45 PM Page 3 (3,1)





# Давід ДУБІНСКІ (1892 - 1982)

## прафсаюзны і грамадзкі дзеяч

*Заканчэньне з папярэдняга нумару*

***Віталь ЗАЙКА***



У 1929 г. Дубінскі быў абраны сакратаром-скарбнікам, а ў 1932 годзе стаў прэзыдэнтам усяго прафсаюзу, захаваўшы пасаду сакратара-скарбніка. Камуністы павялі кампанію супраць Дубінскага, але былі тады заслабыя, каб не дапусьціць агонага абраньня.

Стыль кіраваньня Дубінскага быў досыць жорсткім, у адрозьненьне ад ягоных папярэднікаў. Ён не цярпеў нязгодных, і кожны супрацоўнік кіраўніцтва мусіў перш напісаць недатаваную заяву аб звальненьні, з тым каб не было праблемаў звольніць няўгодных. Але такі стыль аказаўся эфэктыўным у часы надыходзячай Вялікай дэпрэсіі.

Першая палова 20 ст. была досыць бурнай і драматычнай у гісторыі прафсаюзнага руху Амэрыкі. Дзейнасьць прафсаюзных арганізатараў была небясьпечнаю. Часам гаспадары прадпрыемстваў наймалі крымінальнікаў для запалохваньня працаўнікоў і ліквідацыі паасобных прафсаюзных актывістаў. У сваю чаргу, дзеля змаганьня супраць страйкбрэхераў і вымушэньня працаўнікоў далучацца да прафсаюзаў, кіраўнікі некаторых філіяў ня грэбавалі змоваю з крымінальнікамі, што за грошы выконвалі замовы прафбосаў. Акрамя ўсяго, арганізаваныя крымінальныя сындыкаты займаліся рэкетам, імкнуліся да кантролю над прафсаюзамі з мэтаю выбіваньня платы за “пратэкцыю”. У гэтым “бізнэсе” дзеілі такія “славутыя” гангстары, як Лепкэ Бугальтар і Гура Шапіра. Каб супрацьстаяць усім гэтым зьявам, мэтады Дубінскага аказаліся шмат у чым да месца.

У 1931 годзе Дубінскі наведаў Польшчу і СССР, дзе сустракаўся з прадстаўнікамі мясцовых прафсаюзаў, а таксама адведваў сваякоў. Паўсюль ён бываў на фабрыках адзеньня і быў зьдзіўлены, калі на вялізным швачным камбінаце ў Ленінградзе яму з гонарам паведамілі, што 4 тысячы швачак ў дзень вырабляюць 6 тысяч палітонаў. У Амэрыцы за такі час адна працаўніца выраблялa як мінімум 9 палітонаў. Дубінскі ўжо тады зьвярнуў увагу, што лёзунгі на фабрыках былі: “Дагнаць і перагнаць Амэрыку”.

Пасьля няўдалага страйку 1926 г. і асабліва з пачаткам Вялікай дэпрэсіі ў 1929 г. колькасьць сябраў прафсаюзу рэзка скарацілася. Майстэрні й швальні масава зачыняліся, людзі гублялі працу. Частка прадпрыемстваў адмовілася ад прафсаюзнага кантролю. Колькасьць сябраў прафсаюзу скарацілася да 35 тысяч. Дубінскі пераняў кіраўніцтва прафсаюзам у надзвычай складаны пэрыяд, і ад яго шмат у чым залежыла будучыня як арганізацыі, так і ўсіх працаўнікоў, што ўваходзілі ў яе. Яшчэ ў часы прэзыдэнта Гувэра дзеля стымуляваньня эканомікі Кангрэс ЗША ставарыў Фінансавую Карпарацыю па Рэканструкцыі і прыняў Акт Норыса-Ла Гўарды, што зьменшыў перашкоды для прафсаюзнай дзейнасьці.

У лістападзе 1932 г. прэзыдэнтам ЗША быў абраны Франклін Рузвэльт. У той час ягоны посьпех быў больш заснаваны на жорсткай крытыцы Гувэра, чымся на нейкіх новых ідэях у ажыўленьні эканомікі ў рамках аб’яўленага “новага курсу”.

Дубінскаму ў спадчыну дасталася моцна аслаблая арганізацыя са значна зьменеўшай колькасьцю сяброў і з пазыкамі болей за мільён даляраў. Па словах Дубінскага, у ёй панавалі “бязьдзейнасьць, пэсымізм і апатыя”. Аднак дзякуючы энэргіі й асабістым арганізацыйным якасьцям Дубінскага, а таксама рэформам і спрыяльнай для прафсаюзаў палітыцы Ф. Д. Рузвэльта, становішча ў прафсаюзе ІПРЖА паступова пачало выпраўляцца.

У гэты час Дубінскі бліжэй сыйшоўся з камуністамі, што выступалі супраць сталінісцкай плыні, што дамінавала ў КПЗША, і былі змушаныя пакінуць партыю. Галоўным зь іх былі Джэй Лаўстоўн і Чарльз (Саша) Цымэрман, якія зь цягам часу пераўтварыліся ў антыкамуністаў.

У 1936 годзе Дубінскі стаў адным з заснавальнікаў Амэрыканскай партыі працы. Адначасна ён усё больш адыходзіць ад дзейнасьці Сацыялістычнай партыі. Партыя працы заняла палітычную нішу для людзей левых поглядаў, што дыстанцыяваліся ад камуністаў і сацыялістаў, але не былі гатовыя далучыцца да Дэмакратычнай партыі. Партыя спрычынілася да перамогі Рузвэльта пры перадабраньні яго прэзыдэнтам у 1936 г., і з таго часу Дубінскі стаў даволі блізкім сябрам прэзыдэнта, і асабліва Элеаноры Рузвэльт.

Становішча прафсаюзу пад кіраўніцтвам Дубінскага пачало паляпшацца. Ужо ў 1934 годзе колькасьць плоцячых складкі сяброў дасягнула 200 тысяч, а пад канец 1930-х складала больш за 300 тысяч сяброў.

Дубінскі адразу зразумеў пагрозу фашызму і яшчэ ў сакавіку 1933 году стаў адным з арганізатараў вялізнага мітынгу ў Мэдысан Скўэр Гардэн супраць прыходу Гітлера да ўлады ў Нямеччыне. Затым ягоны прафсаюз быў адным з завадатараў байкоту супраць нацыстоўскай Нямеччыны ў 1930-я г.г. Дубінскі падтрымаў ляялістаў Гішпаніі, пераслаўшы значную суму грошай на змаганьне супраць Франка, за што хэрстаўская прэса ахрысьціла яго камуністам. З другога боку, камуністы пасьля падпісаньня Пакту Молатава-Рыбэнтропа клялі Дубінскага як “падпальшчыка вайны” за падтрымку Рузвэльта, які дапамагаў Брытаніі напачатку Другой сусьветнай вайны.

З пачаткам вайны Дубінскі скіраваў намаганьні ІПРЖА на дапамогу працаўнікам і прафсаюзам Польшчы і Нарвэгіі, пазьней праз Польскі ўрад у Лёндане перасылаў сродкі для Варшаўскага гета.

Пасьля вайны Дубінскі й ягоны прафсаюз заставаліся моцнымі гульцамі на палітычным полі Амэрыкі, спрычыніўшыся да абраньня такіх прэзыдэнтаў як Гары Труман, Джон Кэнэдзі і Ліндан Джонсан. Дубінскі й ІПРЖА былі заснавальнікамі Лібэральнай партыі, у якой сам Дубінскі адыграваў вызначальную ролю да адыходу ад справаў у 1966 годзе.

Будучы заўзятым антыкамуністам, Дубінскі, тым ня менш, станоўка выступаў супраць эксцэсаў эпохі макартызму. Называючы самога Макарты з паплечнікамі “самазванымі апосталамі, што пазычаюць у камуністаў сваю тактыку барацьбы”, ён адзначаў, што непераборлівыя мэтады макартызму граюць на руку Саветам, “дэградуючы змаганьне з камунізмам і ператвараючы яго ў палітычны футбол”. Дубінскі заклікаў у 1950-я г.г. да

*Заканчэньне на бачыне 4*

У нядзелю, **17 ліпеня 2011 году,** традыцыйным Маршам пачынаецца

## Тыдзень Паняволеных Народаў,

які былі зацьверджаны Кангрэсам ЗША праз Грамадзкі закон 86-90 яшчэ ў 1959 годзе, як выказ пратэсту народаў сьвету супраць камуністычнай і таталітарнай тыраніі ў сьвеце. У імпрэзах Тыдня і ў Маршы Паняволеных Народаў традыцыйна бярэ ўдзел беларуская грамада Нью-Ёрку і Амэрыкі.

**9:00** – **збор удзельнікаў Маршу** на Пятай авэню і 59-й вуліцы (ля фантану гатэля Пляза).

**10:00** – **імша за Паняволеныя Народы** ў Катэдры сьв. Патрыка на Пятай авэню і 50-й вуліцы.

**11:00** – **Марш Паняволеных Народаў** па Пятай авэню да 72-й вуліцы.

**12:00** – **афіцыйнае адкрыцьцё** Тыдню Паняволеных Народаў у Цэнтральным парку.

Арганізаваны Камітэтам Паняволеных Народаў, які паўстаў у 1950-я гады, Тыдзень Паняволеных Народаў, часткаю якога ёсьць гэты Марш, быў масавай імпрэзай эміграцкіх арганізацыяў з краінаў, якія калісьці зьняволіў савецкі камунізм, у тым ліку Беларусі. Сёньня большасьць тых краінаў вызвалілася і здабыла свабоду.

Беларусь засталася паняволенай прамаскоўскім дыктатарскім рэжымам, там зьліквідаваная дэмакратыя, парушаюцца правы чалавека, зьнішчаецца нацыянальная культура. Таму беларуская грамада працягвае браць удзел у імпрэзах Тыдня Паняволеных Народаў, выказваючы свой пратэст.

# Давід ДУБІНСКІ

***Заканчэньне з бачыны 3***

стварэньня прэзыдэнцкай камісіі па высьвятленьні субвэрсійнай дзейнасьці Саветаў у ЗША. Дубінскі ўхваляў палітыку стрымліваньня СССР і падтрымліваў вайну ў Віетнаме.

Дубінскі таксама актыўна змагаўся супраць карупцыі і крымінальнага ўплыву ў прафсаюзах, якія ўзмоцніліся пасьля вайны. Жорсткімі мэтадамі яму ўдалося "вычысьціць" пэўныя філіі, але дзеля прынцыпу аўтаноміі цалкавітае ачышчэньне шэрагаў прафсаюзных дзеячоў давесьці да канца не было магчымасьці. Гэтаму спрыяла таксама тое, што этнічны склад працаўнікоў моцна зьмяніўся. Колішніх гэбраяў і італьянцаў зьмянілі лацінасы, кітайцы й чарнышы. Мноства прадпрыемстваў перанеслася па-за Нью-Ёрк – на Сярэдні Захад, на Заходняе ўзьбярэжжа і за мяжу. Кіраўніцтва прафсаюзу мела ўсё менш і менш агульнага з шараговымі сябрамі.

Тым ня менш, у 1965 годзе – калі Дубінскі адыйшоў ад справаў на пэнсію, сябрамі прафсаюзу ІПРЖА былі паўмільёна чалавек, і быў ён бясспрэчнаю палітычнаю і эканамічнаю сілаю ў штаце Нью-Ёрк і ва ўсёй краіне.

У гонар заслугаў Давіда Дубінскага ў прафсаюзным руху Амэрыкі ў ягоны гонар была створаная Фундацыя, што носіць ягонае імя, з капіталам у 1 млн. даляраў. У 1969 годзе Дубінскі быў узнагароджаны Прэзыдэнцкім мэдалём свабоды – вышэйшай адзнакай ЗША. **В**

### Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА

Складкі й ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| М. Агароднік | 50 |
| Н. Аўдзейчык | 50 |
| К. Бабенка | 50 |
| В. Бабіч | 50 |
| А. Бабкова | 50 |
| К. Вопсева | 50 |
| С. Голуб | 50 |
| С. Ермакоў | 50 |
| К. Еўсьцігнеева | 50 |
| Я. Іваноў | 50 |
| Т. Каўшовік | 50 |
| М. Клакоцкі | 50 |
| А. Кулажына | 50 |
| І. Куніцкі | 50 |
| Р. Малахоўскі | 50 |
| І. Пікалюк | 50 |
| І. Пракаповіч | 50 |
| А. Шалькевіч | 50 |
| В. Шаўчэнка | 50 |
| К. Шуляк | 50 |
| В. Якімовіч | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*

**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу 11-га чэрвеня 2011 году.**

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі* ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да станцыі* ***Union Square****.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку* ***www.baza-belarus.org***

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі ($30). Чэкі выпісвайце на імя* ***Belarusan American Association****.*

*Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя водгукі й лісты.*

*Допісы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*альбо на адрас электроннай пошты:*
***viestki@mail.com***

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні* :

| | |
|---|---|
| М. Агароднік | 30 |
| Н. Аўдзейчык | 30 |
| К. Бабенка | 30 |
| В. Бабіч | 30 |
| А. Бабкова | 30 |
| К. Вопсева | 30 |
| С. Голуб | 30 |
| С. Ермакоў | 30 |
| К. Еўсьцігнеева | 30 |
| Я. Іваноў | 30 |
| Т. Каўшовік | 30 |
| І. Пікалюк | 30 |
| І. Пракаповіч | 30 |
| А. Шалькевіч | 30 |
| К. Шуляк | 30 |

**Шчыры дзякуй!**

*Паважаны* ***Н. Аўдзейчык*** *паведаміце, калі ласка, рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

*Шаноўныя сябры!*

*Калі Вы атрымліваеце бюлетэнь* ***"Весткі й Паведамленьні"*** *як сябар Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, але яшчэ не рабілі ахвяраваньняў на ягонае выданьне, калі ласка, паведаміце рэдакцыі (поштаю ці праз е-мэйл) аб жаданьні атрымліваць бюлетэнь і, па магчымасьці, падтрымайце выданьне фінансава.*